# ГІСТОРЫЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ БЕЛАРУСІ

# Палітычныя аб’яднанні IX - XIX

- У Полацкім княстве вечавая рэспубліка ўсталявалася пасля 1128 г. палітычная актыўнасць веча “прамая дэмакратыя” натоўпа арганізоўвалася па інтарэсах, вуліцах, раёнах і ўзначальвася групамі алігархіі. Афіцыйна дзяржавай кіраваў выбарны князь, а ад імя веча дакументы замацоўваў архібіскуп.
- У ВКЛ палітычная барацьба адбывалася пры княжаскім двары, сойме, сенаце паміж групоўкамі магнацкіх радавых васальна-кліентальных сетак (Гаштольдаў, Радзівілаў, Сапег, Пацаў). Для адстойвання сваіх інтарэсаў (спачатку эканамічных, а потым палітычных) у канфліктах з дзяржавай пачынаючы з 16 ст. шляхта магла легальна збірацца ў канфедэрацыі, але пасля дасягнення мэты яны распускаліся.
- У лацінскай тэрміналогіі арыстакратычныя групоўкі называліся партыямі. У час грамадзянскай вайны 1698 – 1709 гг. сутыкнуліся партыі “сапежынцаў” і “рэспубліканцаў”, “Фамілія” Чартарыйскіх стала ініцыятарам рэформ РП і сойма 1788 – 1792 гг. дзе яна змагалася з прарускімі і прапрускімі партыямі.

- У першай палове XIX ст. Беларусь была ў складзе Расійскай імперыі ў якой не існавала магчымасці для легальнай палітычнай арганізацыі нават элітарных груп. Мясцовая шляхта арганізоўвалася ў масонскія ложы і патаемныя таварыствы (філаматы, філарэты, прамяністыя, дзекабрысты) якія не былі ўключаны ў паліт. сістэму і могуць разглядацца толькі як грамадскія аб’яднанні. Спробы прыцягнуць сялянскія масы да паўстанняў 1794, 1830, 1863 гг. і рускага народніцтва *не сталі* прычынай самаарганізацыі і падвышэння палітычнай актыўнасці ніжніх слаёў грамадства стварэння масавых партый і рухаў, як у Еўропе.

- Ідэалогія 19 ст. Узнікненне рамантычнага рэвалюцыйнага дэмакратызма, зліцце яго з утапічным сацыялізмам і нацыянальна вызваленчым рухам. Крытыка феадальнага ладу і буржуазнай дзяржавы, адмаўленне ўсялякага эксплуататарскага ладу, глыбокая вера ў светлую будучыню народа.

- Міхал Валовіч, Франц Савіч, К. Каліноўскі, група «Гоман», Ф.Багушэвіч, Я Лучына, А. Гурыновіч – сацыялісты народніцкага нацыянал-вызваленчага кшталту.

- Народнікі з Віцебска (Ратнер, Марчанка) спрабавалі стварыць “Беларускую народную сацыял-рэвалюцыйную партыю”, але ідэя засталася на паперы.
- у 1901 г. у Санкт Пецярбургу была створана Беларуская рэвалюцыйная партыя (БРП) – на чале з Вацлавам Іваноўскім. Тэрмін “рэвалюцыйная” быў уведзены ў назву выключна як індыкатар пануючых настрояў у студэнцкіх колах – партыя ствараліся менавіта навучэнцамі сталічных ВНУ. Аднак БРП, якая праіснвала да 1903 г., так і не стварыла ўласнай праграмы, хоця збіраліся правесці з’езд. Такім чынам, партыяй яна так і не стала. Не імкнуўся да гэтага і сам В.Іваноўскі, які лічыў, што першачарговая задача– абудзіць народ культурна, заняцца кнігавыдавецкай справай. Пра гэта яскрава засведчыў зварот “Да інтэлігенцыі” (1902 г.), які замяніў БРП праграмны маніфест.
- Прыход у БРП маладых актывістаў у канцы 1902 г. (перадусім братоў Луцкевічаў) актывізаваў партыйнае жыццё. У снежні быў нават складзены першы нумар беларускага рэвалюцыйнага часопісу “Свабода” (пазначаны як №1 за 1903). Але наклад часопісу быў знішчаны царскай ахранкай, ад яго засталося толькі некалькі матэрыялаў.
- Няўдача са “Свабодай”, а таксама ідэалагічныя разыходжанні выклікалі ўвесну 1903 г. раскол партыі. Іваноўскі стварыў «Круг беларускай народнай прасветы і культуры», які і заняўся рэалізацыяй “праграмы” БРП. Браты Луцкевічы стварылі Беларускую рэвалюцыйную грамаду (БРГ), якая ў снежні 1903 г. правяла ў Вільні першы свой з’езд. На з’ездзе была ўхваленая праграма партыі БРГ.

# Грамадска-палітычныя структуры і думка ў пачатку ХХ в.

- Пры захаванні няпоўнай сацыяльнай структуры і нізкім статусе беларускага насельніцтва ў Беларусі часоў Расійскай імперыі, узнікае беларускі нацыянальны рух. Цікавасць да праблемаў гісторыі культуры, нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. Галоўнымі асяродкамі палітычных дзеянняў становяцца Пецярбург і Вільня. Беларускія зямляцтвы і арганізацыі да 1 сусветнай вайны нешматлікія, слабаарганізаваныя, носяць культурніцкі характар (напр. Гурток вакол газеты «Наша ніва» ці «Загляне сонца і ў наша ваконца»)

- А. і І. Луцкевічы, В. Іваноўскі, А. Власов, В. Ластоўскі, А. Пашкевіч (Цетка), І. Луцевіч (Я. Купала), К. Міцкевіч (Я.Колас).

# Стварэнне этнічных партый рэвалюцыйна – марксісцкага кшталту

1897 г. -узнікае БУНД (яўрэйскі працоўны саюз)

1898 –РСДРП –рускія марксісты

1902- ПСР (эсэры) і Польская партыя сацыялістаў на Літве-за сялянскую рэвалюцыю

1903- БСГ- беларуская сацыялістычная грамада

Усе яны заклікаюць да звяржэння цара рукамі рабочых, сялян і перадзелу ўлады і маёмасці ў адпаведнасці з іх інтарэсамі

- У 1904 г. ад імя ППС, БСГ, Літоўскай і Латышскай сацыял-дэмакратычнай партый былі выдадзены антываенная адозва «Таварышы» на беларускай, польскай, літоўскай і латышскай мовах і адозва «Брацця сяляне!» на польскай і беларускай мовах ад імя ППС і БСГ. Супрацоўнічаючы з БСГ, ППС не збіралася саступаць ей ініцыятыву ў рабоце сярод беларускага насельніцтва. Актыўную агітацыю сярод беларусаў праводзілі члены гродзенскай арганізацыі ППС на Літве. У 1904 г. у Гродне ППС на Літве стварыла асобную друкарню для выдання беларускамоўных адозваў і брашур. Кіравала друкарняй жонка вядомага лідэра ППС Фелікса Перла. Перакладала тэксты на беларускую мову Яніна Міхнеўская («Пані»), якая была членам Гродзенскага Рабочага Камітэта ППС на Літве. Адозвы распаўсюджваліся сярод сялян бліжэйшых вёсак, а таксама ў Аўгустоўскім павеце Сувалкаўскай губерні. У снежні 1904 г. друкарня была разгромлена паліцыяй.
- Лідэраў ППС хвалявала няпэўнасць БРГ і БСГ у пытанні аб будучых федэрацыйных адносінах з Польшчай. У праграме БСГ, прынятай на з'ездзе, гэтае пытанне неўздымалася. Гэта, відаць, з'явілася адной з прычын таго, што ППС у 1904 г. ініцыявала стварэнне яшчэ адной беларускай арганізацыі – Сацыялістычнай партыі Белай Русі (СПБР) у 1904 г.,. Узнікненне якой  было інспіравана ППС, якая хацела паставіць пад свой кантроль хай і слабую, але ўсё ж такі небяспечную беларускую Грамаду. Перамовы пра пераход апошняй на “канструктыўную пазіцыю” (то бок прыняцце поглядаў ППС) праваліліся, тады пэпээсы ініцыявалі ўтварэнне СПБР. Якая павінна была аб’яднацца з БСГ пасля чаго  вярнуць яе на “ісцінны шлях”. Але гэтая задума правалілася. Дзеячы гэтай партыі – члены Гродзенскай арганізацыі ППС на Літве Браніслаў Шушкевіч, браты Станіслаў і Казімір Трушкоўскія, а таксама пэпээсаўцы з Варшавы Марыян Фальскі і Францішак Завадскі – паходзілі з Беларусі і ведалі беларускую мову. СПБР стварыла свае арганізацыі ў Варшаве, Гродне і Мінску. Партыя выдала некалькі адозваў – такія, як «Настаў час», «Братцы мужыкі!», «Царская гаспадарка», «Якая карысць народу з выбарнага правіцельства», але большага зрабіць не здолела і спыніла сваю дзейнасць напрыканцы 1905 г.
- У пачатку XX ст. у Беларусі дзейнічалі таксама групы сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКП і Л). Яна была створана ў 1900 г. у Мінску. На чале яе стаялі Ф.Э.Дзяржынскі і С. Трусевіч. Партыя імкнулася да цеснага саюза з расійскім рэвалюцыйным рухам, стаяла на інтэрнацыяналісцкіх пазіцыях, вяла барацьбу з сепаратызмам ППС, узаемадзейнічала з Бундам. У красавіку 1906 г. на правах аўтаномнай арганізацыі ўступіла ў РСДРП.

# дзейнасць БСГ

- Каталізатарам развіцця партыі БРГ стала Расейская рэвалюцыя 1905-1907 гг. Яшчэ да гэтага часу, у к. 1904 г., да партыі далучыўся колішні Круг Іваноўскага, што выклікала замену назвы на Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ), якая сталася сапраўдным беларускім палітычным брэндам. У часе рэвалюцыі БСГ актыўна друкавала ўлёткі, праводзіла мітынгі (разам з іншымі сацыялістамі). Пашырыўся ўплыў партыі на сялян – у сакавіку 1905 г. яна разам з эсэрамі зладзіла сялянскі з'езд, на якім было пастаноўлена пра стварэнне Беларускага сялянскага саюзу.
- БСГ удзельнчала ў рэвалюцыі 1905-1907 гг. Стала першай легальнай беларускай партыяй.  У якасці сялянска-рэвалюцыйнай сілы пад эканамічнымі і нацыянальна-культурніцкімі лозунгамі. Летам 1906 г. на Беларусі ў вёсках прайшлі "бульбяныя" забастоўкі, якімі кіравала БСГ
- БСГ пачала выпускаць легальную газету "Наша доля"з 1 верасня па 18 лістапада 1906 г. (7 нумароў)
- І. І А. Луцкевічы, А. Уласаў пачалі выпускаць новую газету "Наша ніва," яна заклікала да парламенцкай барацьбы.

У выніку “маніфеста 17 кастрычніка 1905 г.” створана легальная партыйная сістэма Расійскай імперыі

- На Беларусі было 3 лагера  паліт.партый :
- 1.рэвалюцыянеры: эсэры, РСДРП, Бунд, БСГ, ППС.
- 2.Бурж.- лібералы: кадэты, акцябрысты, трудавікі.
- 3.Правыя : саюз Міхаіла архангела, чарнасоценцы.

Спачатку папулярнымі былі рэвалюцыйныя партыі, але пасля маніфесту 17.10.1905 і сталыпінскіх рэформ, змены ў цэнзах і выбарчых законах перавагу на выбарах у  Думу атрымалі кадэты і правыя.

- З мэтай прадстаўніцтва прадстаўнікоў каталіцкай канфесіі ў палітычным жыцці імперыі і падтрымкі самаўладдзя ствараецца **Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі** на чале з баронам Э. Ропам. Роп узяў праграму партыі кадэтаў і троху адрэдагаваў яе, дапоўніўшы хрысціянскімі прынцыпамі. З мэтай прадстаўніцтва ў Думе апалячаных эліт Паўночна-заходняга краю пад выбары ў III Думу братамі Жукоўскімі быў створаны «Польскі дэмакратычны саюз Беларусі» які падтрымліваў цесную сувязь з Краевай партыяй Літвы і Беларусі. «Краёўцаў» патрабавалі аўтаноміі для супольнага існавання ўсіх народаў рэгіёны і вызвалення іх ад каланіяльнага ціску рускіх. Але з-за абмежаванняў прадстаўніцтва нярускіх і неправаслаўных народаў у Думе ён праваліўся і спыніў існаванне ў тым жа 1907 г. Краёўцы правялі ў III думу толькі 1 дэпутата – Станіслава Ванькові́ч
- У 1906 г. адбыліся першыя выбары ў Дзяржаўную Думу Расійскай імперыі. Сацыялістычныя партыі (у т. л. і БСГ) – іх байкатавалі (ужо ў тым самым годзе яны прызналі гэты крок памылкай і ўзялі ўдзел у выбарах II Думы. Дэпутаты ад Беларусі спачатку трымаліся кадэтаў (80%), але пасля адышлі ад іх пазіцый.
- У студзені 1906 г. адбыўся II з’езд, на якім была ўхваленая новая праграма. БСГ была абвешчана ўжо арганізацыяй не толькі беларускага народу, але ўсёй “працоўнай беднаты беларускага краю”. У дзяржаўных адносінах тэза пра незалежнасць Беларусі была заменена гоманаўскай ідэяй аўтаноміі.
- Другія выбары адбыліся на мяжы 1906-1907 гг. БСГ склала ў Менску блок з іншымі сацыялістамі. Блок перамог, але вынікі выбараў быліануляваныя. Так Беларусы не здолелі дамагчыся прадстаўніцтва для сваёй галоўнай партыі. А ў чэрвені 1907 г. адбыўся дзяржаўны пераварот, рэвалюцыя скончылася, БСГ пастанавіла прыпыніць дзейнасць. Аднак, de-facto яна дзейнічала і надалей – яе актывісты аб’ядналіся ў шматлікія гурткі, кіраўнікі якіх з’яжджаліся ў Вільню на Купалле – кансператыўныя партыйныя з’езды.
- Улетку 1907 г. Раман Скірмунт паспрабаваў стварыць **Краёвую партыю Літвы і Беларусі**, але праект праваліўся і да канца года гэта партыя спыніла сваё існаванне.
- Такім чынам, на 1908 г. у свеце не было аніводнай партыі, якая б мела ў назве слова “беларуская”.

- Ва ўмовах 1 сусветнай вайны рэвалюцыйныя паліт. партыі былі забаронены па абодва бакі фронта. Але грамадскія арганізацыі пад гуманітарнымі шыльдамі аб'ядноўвалі палітычных актывістаў. Так віленскі асяродак аб'яднаўся пад назвай Беларускі Народны камітэт, які ў 1615 г. упершыню афіцыйна агучыў ідэю беларускай дзяржаўнасцці.
- Адной часткай БНК, падпольнай, кіраваў– Антон Луцкевіч, дазволенай немцамі, Беларускім клубам, Іван Луцкевіч. На базе марксісцкіх гурткоў і прафсаюзаў у канцы 1915 г. была створана Беларуская сацыял-дэмакратычная работніцкая група (БСДРГ), якая абвесціла сябе часткай БСГ, стварылі Віленскі камітэт БСГ таму можна лічыць, што ўжо ў 1915 г. адбылося аднаўленне БСГ. У 1917 Яны выступалі за стварэнне аўтаномнай раўнапраўнай беларускай вобласці ў складзе незалежнай Літвы. Але з зімы 1918 г. сталі на пазіцыі незалежнасці БНР і прынялі ўдзел у яе стварэнні.
- Больш правай арганізацыяй была **«Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі»** куды ўваходзілі В. Ластоўскі, В. Святаполк-Мірскі, К. Шафнагель і інш. З 2.6.1917 па 22.4.1918 выдала 4 лістоўкі з выкладам сваіх поглядаў (іх аўтарам лічыцца В. Ластоўскі). Адмаўляла ідэю Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага, паводле якой на беларускіх і літоўскіх землях, акупіраваных Германіяй, прапаноўвалася стварыць беларуска-літоўскую дзяржаву; выступала за злучэнне падзеленай фронтам Беларусі ў «адзін суцэльны і незалежны арганізм». Прапаноўвала ўстанавіць у незалежнай дзяржаве рэспубліканскі лад, правесці беларусізацыю школ, рэлігійных і дзяржаўных устаноў з забеспячэннем правоў нацыянальных меншасцей. Выступала за тое, каб прадстаўнікі беларускага народа «з абедзвюх старон фронту» былі дапушчаны на мірную канферэнцыю і каб яна прызнала незалежнасць Беларусі; выказвала надзею, што польскае грамадства не будзе чыніць перашкоды ў культурным і нацыянальным будаўніцтве. Прызнаючы права літоўскага народа на незалежнасць, арганізацыя выступала супраць анексіяністкіх памкненняў дзеячаў Літвы. Лічыла, што палітычная раўнавага ў Еўропе цесна звязана з вырашэннем украінскага пытання, вітала Украінскую раду і жадала, каб Украіна была прызнана незалежнай дзяржавай. Адначасова выказвалася за федэратыўныя сувязі з суседнімі народамі, вылучала ідэю «Беларуска-Украінскай федэратыўнай дзяржавы». Палажэнні праграмы, распрацаванай «Сувяззю незалежнасці і непадзельнасці Беларусі», прыняты Беларускім народным камітэтам (БНК), канферэнцыяй БНК, Беларускай сацыял-дэмакратычнай работніцкай групай і Віленскім камітэтам Беларускай сацыялістычнай грамады (верасень 1917), а таксама Беларускай канферэнцыяй у Вільні (1918). Палажэнні гэтай праграмы спрабаваў ажыццявіць урад Беларускай Народнай Рэспублікі.

- У той жа час – канец 1915 г. – адбылося арганізацыйнае афармаленне першай правай беларускай партыі – Хрысціянскай злучнасці. Злучнасць узначалілі вядомыя лідары беларускай правіцыі – барон Роп, князь Святаполк-Мірскі, барон Шафнагель, В. Гадлеўскі, А. Астрамовіч (А. Зязюля). Такім чынам, беларускі хрысціянскі рух, які яшчэ ў 1913 г. займеў уласную газету, набыў рысы партыі. Злучнасць звычайна адносяць да ліберальных партый.
- У канцы 1916 г. было абвешчана пра стварэнне яшчэ адной правай партыі – Беларускай народнай партыі сацыялістаў (БНПС, энэсы). Але афармленне партыі да лютага 1917 г. завяршыць не паспелі, і яе першая праграма ўхвалена пазней.

- На Беларусі ў 1915 – 1917 гг. стаяў фронт, згодна з імперскімі прынцыпамі беларусаў бралі служыць на Украіну і ў Прыбалтыку, а тут стаялі часткі укамплектаваныя рускімі, латышамі і каўказцамі. Больш за 2.7 млн беларусаў уцякло ад вайны ў гарады ўсхода Беларусі і Расіі. Абваліўся рынак працы і жытла, узнік дэфіцыт, пачаліся эпідэміі. Бежанства і эканамічны крызіс у Расійскай імперыі зрабілі беларусаў натуральнымі прыхільнікамі радыкальных рэвалюцыйных партый. У Менску, Віцебску, Піцербурзе, Маскве беларускія ўцекачы актыўна ўключыліся ў рускія рэвалюцыйныя партыі (эсэры, РСДРПб, РСДРПм). Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. палітычная дзейнасць і агітацыя былі дазволены нават на фронце. Расійскае войска і ўлады захоўвалі кантроль над зброяй і палітычнай актыўнасццю на Беларусі.
- На Беларусі ўжо ў сакавіку 1917 г. найбольш папулярнай сярод сялян і беднаты, якія складалі да 90% насельніцтва краю, стала праграма сацыялізацыі зямлі эсэраў.

- **25-27 сакавіка 1917 г.** адбыўся І беларускі нацыянальны з’езд – фактычна, з’езд разнастайных беларускіх палітычных арганізацый і рухаў, які, абвесціў сябе краёвай уладай. Дамінавалі на з’ездзе прадстаўнікі БСГ, якая незадоўга да яго пачатку была афіцыйна адноўлена. У створаным Беларускім нацыянальным камітэце (БНК) з 18 чальцоў 10 былі грамадоўцамі. Аднак, раскіданыя па ўсёй імперыі (як, напрыклад, В. Іваноўскі), яны не маглі ўплываць на працу каміэта. Да таго ж, на чале БНК стаў ідэйна блізкі да БНПС Р. Скірмунт. У склад камітэту увайшоў і адзін прадстаўнік Хрысціянскай злучнасці. БНК і надалі яму статус вышэйшай кіруючай установы ў краі.
- У траўні 1917 г. адбылося афармленне БНПС. Была ўхваленая яе праграма, якая насіла ўмераны ў параўнанні з праграмай БСГ характар. У траўні, на з’ездзе кнсяндзоў-беларусаў, завяршылася арганізацыя хадэкаў. Была ўхвалена першая праграма партыі і ўдакладнена назва – у святле новых тэндэнцыяў дадалося слова дэмакратычная (ХДЗ). ХДЗ і БНПС сталіся галоўнымі партыямі правых, супрацістаяла ім - БСГ. Асобна трымалася Беларуская народная грамада (БНГ), створаная ў траўні 1917 г. у Маскве беларусамі-уцекачамі. БНГ межавала з заходнерусамі, яе праграма ў нацыянальных патрабаваннях была вельмі памяркоўнай.
- На пазіцыях заходнерусізму стаялі і шматлікія рэгіянальныя ўтварэнні – кшталту Саюзу беларускай дэмакратыі ў Гомелі, Беларускага камітэту ў Магілёву, Беларускага камітэту ў Воршы, Беларускага народнага саюзу ў Віцебску. Гэтая арганізацыя, фарбаваліся ў беларускія і дэмакратычныя колеры, але заставаліся, па сутнасці абаронцамі старога імперскага ладу. У 1917 г. яны бралі ўдзел у выбарах ва Устаноўчы сход, але іх напаткала няўдача. Затое віцебскі БНС атрымаў значнае прадстаўніцтва ў віцебскай гарадской думе.
- Цікава адзначыць эвалюцыю магілёўскага камітэту, які паступова перайшоў на сапраўды нацыянальную платформу. У 1918 г. ён падтрымаў БНР.

- 8-12 ліпеня 1917 г. адбыўся II нацыянальны з’езд. На ім гучала вострая крытыка БНК і ягонага старшыні Скірмунта. Плён ад дзейнасці камітэту быў невялікі – у той час, калі суседняя Украіна ўжо пайшла па шляху фармавання падмурку аўтаноміі, беларусы не мелі нават абяцанняў ад ураду (знакамітае “Россия не этнографический музей!”). Была створана Дэкларацыя з патрабаваннем аўтаноміі для Беларусі, якую адвезлі ў Петраградскі часовы Урад . Але Керанскі яе праігнараваў, адклаўшы разгляд пытання да як мінімум Усерасійскага Устаноўчанга схода, запланаванага на кастрычнік 1917.
- БНПС і ХДЗ разумелі, што БСГ хоча аднаасобна ўзначаліць новы кіраўнічы орган. Скірмунт паспяшаўся пайсці ў адстаўку і абвясціў нават пра сваё далучэнне да энэсаў. Пасля адбыліся выбары Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый (ЦРБА). Правыя вылучылі на старшыню Рады кандыдатуру П. Алексюка (БНПС), але ён, натуральна, праваліўся. Тады чальцы БНПС пакінулі з’езд.
- І сапраўды, ЦРБА была выняткава грамадоўскім органам. На чале рады стаў Язэп Лёсік, у складзе выканкаму першага складу былі адны грамадоўцы (Я. Лёсік, Р. Астроўскі, А. Смоліч, З. Жылуновіч і інш.). Але ЦРБА мела яшчэ меней плёну за БНК.
- 1917 г. у Мінску прайшоў II з’езд прадстаўнікоў беларускіх партый, арганізавана Цэнтральная рада
- Адзначым яшчэ адну цікавую арганізацыю, якая паўстала ўвесну 1917 г. – Беларускую партыю аўтанамістаў (БПА). БПА існавалі сярод уцекачоў за межамі Беларусі і актыўнай ролі ў палітычным жыцці не адгуляла, але затое валодала даволі цікавай праграмай (верасень 1917 г.). Аўтанамісты патрабавалі шырокай аўтаноміі для Беларусі без разрыву з Расеяй, а ў папаравах да праграмы, надрукаваных у кастрычніку 1917 г., патравабалі ад Часовага ўраду тэрмінова надаць Беларусі статус аўтаноміі.
- Некаторыя лідары БСГ у жніўні 1917 г. на I сэсіі ЦРБА вымагалі абвесціць аўтаномію, падобна Украіне, “рэвалюцыйным” шляхам.

- Асноўнай сілай беларускага нацыянальнага руху заставалася левая БСГ. У чэрвені 1917 г. грамада паспрабавал зладзіць III з’езд парты, але праз унутраныя канфлікты ён пазней быў зніжаны да канферэнцыі. Абраны ЦК і ўхваленая праграма набылі паметку “часовых”. Старшынём часовага ЦК БСГ стаў замест правага А. Смоліча, які ўзначальваў партыю з сакавіка, З. Жылуновіч, які належаў да левай плыні ў партыі.
- Беларуская народная партыя сацыялістаў узнікла летам 1917 г. нешматлікую групу інтэлігентаў, якія былі блізкімі да Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), але лічылі яе праграму і тактыку залішне радыкальнымі.У Арганізацыйнае бюро БНПС уваходзілі Я.Ф. Сушынскі (старшыня), А.І. Лявіцкі (Ядвігін Ш.), Самуіл Плаўнік (Змітрок Бядуля), Ф. Стульба; значным уплывам у партыі карыстаўся Павел Аляксюк і Раман Скірмунт. З канца ліпеня 1917 існаваў аддзел БНПС м. Смілавічы (Ігуменскі павет) на чале з ксяндзом Аляксандрам Астрамовічам. Але да 1918 г. спыніла існаванне
- Адзнакай сілаў паасобных партыяў сталіся дэмакратычныя выбары ў органы самакіравання – земствы, гарадскія думы, рады. Беларускія партыя збольшага пацярпелі паразы, так, у Менску 1 мандат у думе атрымала БНПС (яна брала ўдзел у выбарчай кампаніі ў складзе шырокага сацыялістычнага блоку), ва ўсходнебеларускіх гарадах – тутэйшыя заходнерусы: СБН у віцебскай думе меў 7%, Беларускі камітэт у Магілёўскай 9,4%. Дамінавалі амаль паўсюдна расейскія сацыялісты: у Менску эсэры атрымалі 32,9% месцаў у думе, у Магілёве перамогу атрымаў блок сацыялістаў (45,9%), у Віцебску – блок памяркоўных сацыялістаў (36,9%). Бальшавікі атрымалі нязначную колькасць галасоў (так, 16% у Віцебску выглядаюць найвялікшым поспехам).
- Спрабуючы паставіць мясцовы патрыятызм на службу Расіі, у ліпені-кастрычніку 17 г. было дазволена сфарміраваць нацыянальныя бел. часткі і саветы на франтах і флоце
- Рада разам з балшавікамі выступіла супраць «мецяжу» генерала Карнілава.
- У чаканні Усерасійскага Устаноўчага сходу ў кастрычніку 1917 г., актывізуецца і беларускі рух. Адбываюцца адразу тры прадстаўнічыя форумы: з’езд вайскоўцаў-беларусаў Заходняга фронту, II сэсія ЦРБА і III з’езд БСГ (усе тры праходзілі паралельна). Адзначым найбольш важныя выніка гэтых сходаў: 15 -24 кастрычніка 1917г. – пры ўдзеле ЦБР і ЦБВР створана Вялікая Беларуская Рада, з прэтэнзіяй на дзяржаўную ўладу ў краіне, стварэнне Цэнтральнай вайсковай беларускай рады (ЦБВР) і прыняцце новай праграмы БСГ. У склад выканкаму ВБР увайшлі два прадстаўнікі энэсаў. Такім чынам, адбыалася кансалідацыя беларускіх партый.

- У ноч 25 кастрыніка 1917 г. уладу над Петраградам захапілі бальшавікі і абвесцілі сябе ўладай у Расіі
- 26.10.17 г. у адказ на звесткі аб бальшавісцкім путчы, кантроль над Мінскам узяў камітэт Выратавання рэвалюцыі (кадэты, меншавікі), падтрыманы Каўказскай дывізіяй.шэраг беларускіх партыяў не прыняла пераварот і падпісалі «Грамату да беларускага народа» 27 кастрычніка (9 лістапада) 1917 г., дзе рэвалюцыя характарызавалася як праяўленне анархіі, у віхуры якой можа загінуць справа абароны нацыянальных правоў беларусаў.
- 2.11.1917 г. у Мінск увайшоў бальшавіцкі бронецягнік з салдатамі і яны захапілі горад.
- У лістападзе быў захоплены Магілеў і праведзены перавыбары ў Саветы - большасць месцаў атрымалі бальшавікі. Адбыўся перадзел маёмасці.
- Бальшавікамі быў створаны і апанаваны орган кіравання арміяй і цывільным насельніцтвам СНК зах. Вобласці і фронта .

- 15 снежня 1917 г.- Усебеларускі з’езд.
- Сабралася 1872 дэпутаты.
- Большасць дэпутатаў – эсэры і беспартыйныя.
- СНК Заходняй вобласці (К. Ландэр) прыняў рашэнне разагнаць з’езд і 18 снежня – гэта зрабілі расійскія вайскоўцы.
- З’езд паспеў абраць Раду, з’езд не адмаўляў уладу бальшавікоў, хаця выступалі толькі за аўтаномію Беларусі.
- Фронт разваліўся. Бальшавікі ўцяклі. Да прыхода немцаў у Менск 21 лютага 1917 г. І устаўная грамата БНР – Рада абвясціла сябе уладай, паабяцана склікаць Усебеларускі ўстаноўчы сход.

- *25 сакавіка 1918 г.* – *III Устаўная грамата БНР* абвясціла непрызнанне Брэсцкага міру і <u>дзяржаўную незалежнасць БНР.</u>
- 27.03.1918 г. немцы перадалі Радзе БНР бел. прадстаўніцтвы пры сваіх камендатурах па эканамічных, адукацыйных і прапагандысцкіх пытаннях. Бунд і РСДРП пратэстуючы супраць супрацоўніцтва з немцамі выйшлі з Рады.
- 25.04.1918- падзяка Вільгельму II (Р. Скірмунт) –раскол рады БНР і БСГ (БПСР, БПСФ і інш).
- Аднак нямецкая улада не прызнавалася за сваю насельніцтвам. А калі немцы адступілі, насельніцтва масава ўхілялася ад удзелу ў вайне на любым баку. Пасля прыходу бальшавікі ў 1918 1920 г. праводзілі палітыку па знішчэнні бел. актывістаў і прымусовую мабілізацыю ў ЧА.

- **Беларускі хрысціянскі палітычны рух** паўстаў у пачатку XX ст. ў асяродках беларускіх студэнтаў-тэолагаў і семінарыстаў. Хрысціянская дэмакратычная злучнасць (ХДЗ) заснавана ў маі 1917 г. у Петраградзе. Напачатку ХДЗ аб'ядноўвала невялікія гурткі беларускай інтэлігенцыі з настаўнікаў, слухачоў Пецярбургскай духоўнай акадэміі (Беларускі гурток студэнтаў Пецярбургскай каталіцкай духоўнай акадэміі створаны ў 1913 г.), клерыкалаў Мінска.
- Заснаванне ХДЗ садзейнічала актывізацыі грамадска-палітычнай дзейнасці каталіцкага духавенства непасрэдна на Беларусі. На з'ездзе беларускага каталіцкага духавенства 24-25 мая 1917 г. у Мінску адным з галоўных пытанняў была дзейнасць беларускай каталіцкай партыі (дакладчык В. Гадлеўскі). У прынятай рэзалюцыі адзначалася, што «з'езд дамагаецца аўтаноміі ў Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспубліцы». Прадстаўнікі хрысціянскіх дэмакратаў уваходзілі ў Беларускі нацыянальны камітэт, удзельнічалі ў Першым Усебеларускім з'ездзе ў Мінску ў снежні 1917 г. У 1918 г. хрысціянскія дэмакраты віталі акт абвяшчэння незалежнай беларускай дзяржавы — БНР.
- Першапачаткова сувязі ХДЗ з сялянствам былі нязначныя. У пачатку 1920-х гадоў яе гурткі існавалі ў Дзісне, Друі, Іказні, Барадзенічах, Шаркоўшчыне, Ашмянах, Барунах. Іх арганізатарамі былі ксяндзы Ф. Абрантовіч, В. Ташкун, А. Станкевіч, М. Пятроўскі, Я. Германовіч і інш., якія вялі культурна-асветную работу выключна сярод беларусаў-католікаў. У выніку гэтага ў 1920 г. налічвалася крыху больш за 500 членаў ХДЗ. У якасці актыўнага ўдзельніка Беларускага нацыянальнага камітэта (ад ХДЗ у яго ўваходзіў В. Гадлеўскі), а ў далейшым і Вялікай Беларускай Рады ХДЗ падтрымлівала Часовы ўрад А. Керанскага, паступова заняла адмоўныя пазіцыі ў адносінах да Савецкай улады. На I з'ездзе ХДЗ у лютым 1918 г. у Петраградзе гаварылася, што ў адносінах да такіх народаў як літоўцы, латышы, беларусы і ўкраінцы, трэба стаяць на грунце поўнага іх самавызначэння.
- Рэвалюцыйныя настроі, якія пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ахалілі працоўных і пэўныя колы беларускай інтэлігенцыі, у т.л. духавенства, адбіліся і на змесце 1-й праграмы ХДЗ, прынятай у 1920 г. у Мінску. У 2-м яе пункце падкрэслівалася, што *«хрысціянская дэмакратыя змагаецца перад усім з капіталізмам, у каторым бачыць адну з найважнейшых прычын беднасці і галечы працоўных мас і хоча завесці такі лад, каб кожнаму чалавеку магчыма было сваёй працай здабыць сабе хлеб патрэбны і карыстацца з усяго культурнага багацця»*.

# Савецкі перыяд

- Дамінаванне марксісцкай ідэалогіі, тэорыі гістарычнага матэрыялізма. Стварэнне псеўдааўтаномнага нацыянальнай дзяржаўнасцці, аднапапартыйнай сістэмы, будаўніцтва савецкага народа, інтэрнацыяналізацыя грамадскай ідэнтычнасці, гісторыі, думкі.

- В.Г. Кнорынш, Д.Ф Жылуновіч, А. Г. Чэрвякоў,
- В.М. Ігнатоўскі, К.Т. Мазураў, П.М Машераў.

- У 18 - 20Я ГГ. Ў ВЫНІКУ ВЫНІШЧЭННЯ БАЛЬШАВІКАМІ ІНШЫХ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ КАНКУРЭНТАЎ (У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ЭСЭРАЎ) І БАРАЦЬБЫ Ў ПАРТЫЙНЫМ АПАРАЦЕ Ў КП СССР БЫЛА РАЗГРОМЛЕНАЯ «УЛЬТРАЛЕВАЯ («ТРАЦКІСЦКАЯ») І «НАЦЫЯНАЛ. - ДЭМАКРАТЫЧНАЯ» АПАЗІЦЫЯ. У СССР УСТАЛЯВАЛАСЯ «СТАЛІНСКАЯ» МАДЭЛЬ КІРАВАННЯ І ІДЭАЛОГІІ.

- Стварэнне таталітарнай савецкай сістэмы.
- На 1920г. у КПБб-1700 ч. у БПС(Р)-20000
- Люты 1921-арышт 860 эсэраў, т.с. дэфензіва ў Польшчы. ЧК арыштоўвае ўсіх маладзежных актывістаў акрамя ВЛКСМ.
- Сакавік 1921 самароспуск БПСР і Бунд і пераход іх сяброў у склад КПБб
- 1923 г. амністыя антысаветчакам
- 1925г. манаполія КПБб у сац.-паліт. дзейнасці.
- У 1929г. У КПБ -3 700, у 1933 г. -65 000 сяброў.
- 1936-1939 растрэл зах.бел. эмігрантаў як шпіёнаў (Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі і гд.) ліквідацыя несталінскай беларускай эліты

- Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (1922 - 1923)
- Сацыялістычная партыя Белай Русі (1904 - 1905)
- Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (1917 - 1918)
- Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (1918 - 1924) (1918 - 1924)
- Беларуская сацыял-дэмакратычная работніцкая група (1915 - 1918)
- Беларуская народная партыя сацыялістаў (1917)
- Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя
- Беларуская незалежніцкая партыя (1942 - ?)
- Беларуская партыя незалежных сацыялістаў (1922 - 1925)
- Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (красавік 1918 - верасень 1924)
- Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў
- Камуністычная партыя Літвы і Заходняй Беларусі (1918 - 1919)
- Беларуская сялянская партыя "Зялёнага Дуба" (1919 - 1924)
- Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (1923 — 1938)

**Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя** *(БСДП), эсдэкі* — палітычная партыя на Беларусі ў 1918 — палітычная партыя на Беларусі ў 1918—1924 — палітычная партыя на Беларусі ў 1918—1924. Папярэдніцай БСДП была Беларуская сацыялістычная грамада — палітычная партыя на Беларусі ў 1918—1924. Папярэдніцай БСДП была Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), якая ўяўляла сабой блок народнікаў і марксістаў. У 1915 — палітычная партыя на Беларусі ў 1918—1924. Папярэдніцай БСДП была Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), якая ўяўляла сабой блок народнікаў і марксістаў. У 1915 на тэрыторыі Беларусі, акупіраванай нямецкімі войскамі, марксісты (І. І. Луцкевіч — палітычная партыя на Беларусі ў 1918—1924. Папярэдніцай БСДП была Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), якая ўяўляла сабой блок народнікаў і марксістаў. У 1915 на тэрыторыі Беларусі, акупіраванай нямецкімі войскамі, марксісты (І. І. Луцкевіч, А. — палітычная партыя на Беларусі ў 1918—1924. Папярэдніцай БСДП была Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), якая ўяўляла сабой блок народнікаў і марксістаў. У 1915 на тэрыторыі Беларусі, акупіраванай нямецкімі войскамі, марксісты (І. І. Луцкевіч, А. І. Луцкевіч — палітычная партыя на Беларусі ў 1918—1924. Папярэдніцай БСДП была Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), якая ўяўляла сабой блок народнікаў і марксістаў. У 1915 на тэрыторыі Беларусі, акупіраванай нямецкімі войскамі, марксісты (І. І. Луцкевіч, А. І. Луцкевіч, Цётка — палітычная партыя на Беларусі ў 1918—1924. Папярэдніцай БСДП была Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), якая ўяўляла сабой блок народнікаў і марксістаў. У 1915 на тэрыторыі Беларусі, акупіраванай нямецкімі войскамі, марксісты (І. І. Луцкевіч, А. І. Луцкевіч, Цётка і інш.) выйшлі з БСГ і ўтварылі Беларускую сацыял-дэмакратычную работніцкую групу (БСДРГ).

Пасля расколу БСГ (красавік 1918) беларускія марксісты, якія дзейнічалі ва Усходняй Беларусі, аб'ядналіся з БСДРГ і ўтварылі з ёю БСДП. Асноўныя прынцыпы БСДП — свабода, роўнасць, братэрства, дэмакратыя, прававая дзяржава. Сацыяльная база — кваліфікаваныя рабочыя, адукаваныя сяляне, рамеснікі, інтэлігенцыя. Актыўнымі дзеячамі партыі былі В. Л. ІваноўскіПасля расколу БСГ (красавік 1918) беларускія марксісты, якія дзейнічалі ва Усходняй Беларусі, аб'ядналіся з БСДРГ і ўтварылі з ёю БСДП. Асноўныя прынцыпы БСДП — свабода, роўнасць, братэрства, дэмакратыя, прававая дзяржава. Сацыяльная база — кваліфікаваныя рабочыя, адукаваныя сяляне, рамеснікі, інтэлігенцыя. Актыўнымі дзеячамі партыі былі В. Л. Іваноўскі, І. І. КраскоўскіПасля расколу БСГ (красавік 1918) беларускія марксісты, якія дзейнічалі ва Усходняй Беларусі, аб'ядналіся з БСДРГ і ўтварылі з ёю БСДП. Асноўныя прынцыпы БСДП — свабода, роўнасць, братэрства, дэмакратыя, прававая дзяржава. Сацыяльная база — кваліфікаваныя рабочыя, адукаваныя сяляне, рамеснікі, інтэлігенцыя. Актыўнымі дзеячамі партыі былі В. Л. Іваноўскі, І. І. Краскоўскі, ЛуцкевічыПасля расколу БСГ (красавік 1918) беларускія марксісты, якія дзейнічалі ва Усходняй Беларусі, аб'ядналіся з БСДРГ і ўтварылі з ёю БСДП. Асноўныя прынцыпы БСДП — свабода, роўнасць, братэрства, дэмакратыя, прававая дзяржава. Сацыяльная база — кваліфікаваныя рабочыя, адукаваныя сяляне, рамеснікі, інтэлігенцыя. Актыўнымі дзеячамі партыі былі В. Л. Іваноўскі, І. І. Краскоўскі, Луцкевічы, Я. Ю. ЛёсікПасля расколу БСГ (красавік 1918) беларускія марксісты, якія дзейнічалі ва Усходняй Беларусі, аб'ядналіся з БСДРГ і ўтварылі з ёю БСДП. Асноўныя прынцыпы БСДП — свабода, роўнасць, братэрства, дэмакратыя, прававая дзяржава. Сацыяльная база — кваліфікаваныя рабочыя, адукаваныя сяляне, рамеснікі, інтэлігенцыя. Актыўнымі дзеячамі партыі былі В. Л. Іваноўскі, І. І. Краскоўскі, Луцкевічы, Я. Ю. Лёсік, С. А Рак-МіхайлоўскіПасля расколу БСГ (красавік 1918) беларускія марксісты, якія дзейнічалі ва Усходняй Беларусі, аб'ядналіся з БСДРГ і ўтварылі з ёю БСДП. Асноўныя прынцыпы БСДП — свабода, роўнасць, братэрства, дэмакратыя, прававая дзяржава. Сацыяльная база — кваліфікаваныя рабочыя, адукаваныя сяляне, рамеснікі, інтэлігенцыя. Актыўнымі дзеячамі партыі былі В. Л. Іваноўскі, І. І. Краскоўскі Луцкевічы, Я. Ю. Лёсік, С. А. Рак-Міхайлоўскі, А. Пасля расколу БСГ (красавік 1918) беларускія марксісты, якія дзейнічалі ва Усходняй Беларусі, аб'ядналіся з БСДРГ і ўтварылі з ёю БСДП. Асноўныя прынцыпы БСДП — свабода, роўнасць, братэрства, дэмакратыя, прававая дзяржава. Сацыяльная база — кваліфікаваныя рабочыя, адукаваныя сяляне, рамеснікі, інтэлігенцыя. Актыўнымі дзеячамі партыі былі В. Л. Іваноўскі, І. І. Краскоўскі, Луцкевічы, Я. Ю. Лёсік, С. А. Рак-Міхайлоўскі, А. А. СмолічПасля расколу БСГ (красавік 1918 беларускія марксісты, якія дзейнічалі ва Усходняй Беларусі, аб'ядналіся з БСДРГ і ўтварылі з ёю БСДП. Асноўныя прынцыпы БСДП — свабода, роўнасць, братэрства, дэмакратыя, прававая дзяржава. Сацыяльная база — кваліфікаваныя рабочыя, адукаваныя сяляне,

- 1928 г. працэсы “56” БСРГ і “133”супраць КПЗБ,і ”16”(1936) у Вільні. З 1934 г. дзейнічае Бяроза-Картузскі лагер праз яго да 10000 вязняў(1200 КПЗБ). У КПЗБ 1932 г. -3600 чал. 1935 г. Камінтэрн выдае “загад аб стварэнні антыфаш. фронту” КПЗБ дамовіліся з Бундам, Палейцыенам, БХД і інш. Дэманстрацыі ў Гародні, Берасці, Нарачы (1935г.) і тд.

- За час свайго існавання БХЗ/БХД прайшла эвалюцыю ад арганізацыі клерыкальнага кірунку да свецка-клерыкальнай палітычнай партыі. Усе пяць праграм БХД, пачынаючы з 1920 г., адстойвалі канфіскацыйную зямельную рэформу без грашовай кампенсацыі былым зямельным уласнікам. 2-я праграма (1927) дэкларавала, што «БХД імкнецца да самастойнасці беларускага народу на ўсіх яго землях, аб'яднаных у незалежную дэмакратычную рэспубліку». У 4-й праграме (1932) падкрэслівалася, што «БХД прынцыпова супраць аддзялення касцёла ад дзяржавы і змагаецца з палітыкай, што выкарыстоўвае рэлігію для палітычных мэтаў, або падтрымлівае адну рэлігію супраць другой». Адзначалася таксама абавязковасць вывучэння рэлігіі «як у школах урадавых, так і ў школах прыватных». Больш выразна апошнія праграмы БХД ставілі сацыяльныя пытанні, як вынік працэсу радыкалізацыі, што ахапіла нізавыя гурткі партыі. Так, у §34 абноўленай 4-й праграмы адзначана, што *«ўсе землі, перавышаючыя працоўную норму, перадаюцца ва ўласнасць і без выкупу беззямельным і малазямельным сялянам»*. Змяшчаліся патрабаванні 8-гадзіннага рабочага дня, права на забастоўку, стварэння рабочых камітэтаў з правам нагляду за вытворчасцю і прыбыткамі і інш.
- З мэтай пашырэння сацыяльнай базы партыі ў чэрвені 1926 г. у Вільні быў адкрыты Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК) як філіял БХД. Пры дапамозе розных гаспадарчых і культурна-асветных мер (выдача грашовых пазык, стварэнне сялянскіх кааператываў і інш.) рабіліся спробы ўзмацніць уплыў БХД сярод сялян. З гэтай жа мэтай на II (1927) і III (1928) з'ездах партыі было падкрэслена, што сябрамі БХД з'яўляюцца не толькі беларусы-католікі, але і праваслаўныя. З ліку тых і другіх выбіраўся склад членаў ЦК БХД. Гэта спрыяла колькаснаму росту партыі.
- На IV з'ездзе БХД (1931), які быў самы шматлікі і апошні, прысутнічалі 101 прадстаўнік і 24 госці ад Ашмянскага, Баранавіцкага, Браслаўскага, Валожынскага, Ваўкавыскага, Вілейскага, Віленска-Трокскага, Дзісенскага, Лідскага, Пастаўскага і Сакольскага паветаў. На працягу 1931—1934 гг. колькасць гурткоў БІГіК вырасла з 12 да 51 (налічвалі 937 чал.). Паступова БХД заняла лідзіруючае становішча ў Беларускім нацыянальным камітэце сярод партый і груп беларускага нацыянальнага лагера. Да сярэдзіны 1930-х гг. яна засталася адзінай беларускай нацыянальнай партыяй, якая захавала і павялічыла свой колькасны склад
- З 2-й пал. 1920-х гг. Беларуская хрысціянская дэмакратыя бярэ курс на пераўтварэнне партыі ў грамадска-палітычную арганізацыю на грунце агульнахрысціянскай ідэалогіі, што знайшло адлюстраванне ў 5-й праграме (1936) і змене назвы БХД на Беларускае нацыянальнае аб'яднанне (БНА). У склад новага ЦК БНА (выбраны ў студзені 1936 г.) увайшлі А. Клімовіч, Я. Пазняк, Я. Малецкі, М. Дварэцкі, Я. Найдзюк, Я. Шутовіч, В. Нарановіч-Бабарыка, Я. Чарнецкі, Я. Ярмаковіч, М. Казаровіч; у яго прэзідыум — Я. Пазняк (старшыня), С. Грынкевіч (1-ы віцэ-старшыня), М. Дварэцкі (2-і віцэ-старшыня), А. Клімовіч.

- Змена назвы партыі павінна была паказаць незалежнасць ад кліра і прэтэнзію на аднаасобнае палітычнае прадстаўніцтва беларускага народа. У якасці галоўнай палітычнай мэты ў праграме падкрэслівалася імкненне БНА да таго, «каб у незалежнай Беларусі быў створаны такі грамадскі лад, які абапіраючыся на працу, грамадскую роўнасць і справядлівасць, не дапускаючы да эксплуатацыі адных другімі, забяснечваў бы палітычна-грамадскія, культурныя і эканамічныя патрэбы грамадзян. БНА супраць дыктатуры капіталізму фашызму і камунізму». Выхад з цяжкага становішча працоўных кіраўніцтва БНА бачыла ў арганізацыі кааператываў, асветна-гаспадарчых гурткоў, бібліятэк-чытальняў і інш. У праграме гаварылася, што «БНА да сваіх мэт ідзе дарогай арганізацыі, усведамлення беларускага сялянства, работнікаў і інтэлігенцыі, на аснове грамадскай роўнасці і справядлівасці і беларускай народнай культуры». Кіраўнікі БНА у зямельным пытанні па-ранейшаму лічылі хутарскую сістэму «найбольш адпаведнай формай прыватнай зямельнай гаспадаркі». Праграма адзначала, што «БНА, стоячы на прынцыпе самастанаўлення народаў, імкнецца да самастойнасці беларускага народа ва ўсіх яго этнаграфічных землях, аб'яднаных у незалежную дзяржаву». У намечаных шляхах вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем было шмат супярэчлівага. Кіраўнікі БНА прэтэндавалі трэці шлях грамадскага развіцця, які не знайшоў канкрэтнага адлюстравання ў палітычных праграмах партыі.
- Кіраўніцтва БНА адмоўна сустрэлі прапанову ЦК КПЗБ стварыць адзіны фронт барацьбы супраць курсу польскіх улад на дэнацыяналізацыю беларускага насельніцтва. Аднак у лютым 1936 г. паміж БІГіК і Таварыствам беларускай школы (знаходзілася пад уплывам КПЗБ) было заключана пагадненне пра адзінства дзеянняў у справе барацьбы за школу на роднай мове. Гэта выклікала раскол, у чэрвені 1936 г. кансерватыўна настроеная частка членаў БНА не прыняла ідэі супрацоўніцтва з камуністамі і стварыла т.зв. Беларускі народны фронт (БНФ) на чале з В. Гадлеўскім.
- Адначасова польскія ўлады пільна сачылі за любымі праявамі апазіцыйных настрояў сярод беларускага нацыянальнага лагера. У снежні 1936 г. паводле пастановы Віленскага старостава спынена дзейнасць БІГіК. З-за ганенняў і ўціску з боку польскай адміністрацыі ў 1937 г. спынілася выданне «Беларускай крыніцы». У 1938 г. забаронены віленскі Беларускі нацыянальны камітэт. Праследаваліся многія актывісты БНА. У выніку да канца 1930-х гг. дзейнасць БНА была моцна аслаблена.

- У 1933 г. **Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя** (БНСП) — арганізацыя беларускіх нацыянал-сацыялістаў у Заходняй Беларусі.Пачала стварацца ў 1933 у Вільні па ініцыятыве групы пранямецка настроеных беларускіх дзеячаў. З 1934 працаваў прэзідыум Беларускага нацыянал-сацыялістычнага актыву (старшыня Фабіян Акінчыц), які ў пачатку 1937 пераўтвораны ў Цэнтральны камітэт БНСП. З восені 1933 Фабіян Акінчыц разам з У. Казлоўскім пачалі выданне часопіса «Новы шлях», органа БНСП, дзе шмат увагі аддавалі абгрунтаванню і апраўданню ідэалогіі нацыянал-сацыялізму. Наклад часопіса не перавышаў 500 экзэмпляраў, што сведчыць аб слабай падтрымцы БНСП сярод беларускага насельніцтва.
- БНСП займала выразныя антысавецкія і антыкамуністычныя пазіцыі, не прымала ідэі кансалідацыі заходнебеларускага руху. У праграме 1936 яе лідары дэкларавалі замену капіталістычнага ладу сацыялістычным. Падкрэслівалася, што «палітычным ідэалам ёсць незалежная і аб'яднаная беларуская дзяржава ў яе этнічных межах».
- Да БНСП прымкнула група незалежных беларускіх радыкалаў на чале з паслом сейма К. Юхневічам. Аднак з-за малалікасці членаў так і не ўдалося склікаць яе з'езд[1].
- Забаронена польскімі ўладамі, лідар БНСП Ф. Акінчыц у 1939 перабраўся ў Берлін.
- 1937 у БССР растраляны абмененыя на польскіх шпіёнаў Рак-Міхалоўскі,1938-Б.Тарашкевіча,1939-М.Гарэцкі. 1938 г. Сталін абвінаваціў КПЗБ у тым што тая пранізана агентамі польскай дыфензівы і адбываецца ліквідацыя КПЗБ. 1939-1946 гг. Знішчаецца актыў іншых партый. Пасля ўваходу ў СССР і БССР не існуе іншых партый, акрамя КПБ
- Ствараецца аднапартыйная сістэма.

- Беларускія  нацыяналісты ў гады ВАВ
- Пасля ўз'яднання БеларусіПасля ўз'яднання Беларусі, у 1939—1940 гг. многія лідары і актывісты БХД за сваю дзейнасць былі рэпрэсаваныя савецкімПасля ўз'яднання Беларусі, у 1939—1940 гг. многія лідары і актывісты БХД за сваю дзейнасць былі рэпрэсаваныя савецкім, а пасля і нацысцкім рэжымам, у 1940 г. партыя спыніла сваё існаванне.
- Летам 1943 г. ў выніку аб'яднання членаў БНА (на чале з С. ГрынкевічамЛетам 1943 г. ў выніку аб'яднання членаў БНА (на чале з С. Грынкевічам), Партыі беларускіх нацыяналістаў (пад кіраўніцтвам Я. Станкевіча) і некалькіх іншых, больш дробных, груп створана нелегальная арганізацыя пад назвай Беларускае нацыянальна-дэмакратычнае аб'яднанне. Яна арыентавалася на супрацоўніцтва з польскім падполлем, шырокай дзейнасці разгарнуць не здолел
- Беларуская Незалежніцкая Партыя была ўтворана праўдападобна на мяжы 1939—1940 у ВільніБеларуская Незалежніцкая Партыя была ўтворана праўдападобна на мяжы 1939—1940 у Вільні (паводле іншай версіі, у МінскуБеларуская Незалежніцкая Партыя была ўтворана праўдападобна на мяжы 1939—1940 у Вільні (паводле іншай версіі, у Мінску ў 1942Беларуская Незалежніцкая Партыя была ўтворана праўдападобна на мяжы 1939—1940 у Вільні (паводле іншай версіі, у Мінску ў 1942). Ініцыятарам яе ўзнікнення быў адзін з ідэолагаў беларускага нацыянальнага руху ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, а аб’ядноўвала яна дзеячаў маладога пакалення.
- Кіравалася створанымі да восені 1942 Цэнтральным Камітэтам і пяццю акруговымі камітэтамі. Кіраўнікі: Усевалад РодзькаКіравалася створанымі да восені 1942 Цэнтральным Камітэтам і пяццю акруговымі камітэтамі. Кіраўнікі: Усевалад Родзька (цэнтральны камітэт), Міхал ВітушкаКіравалася створанымі да восені 1942 Цэнтральным Камітэтам і пяццю акруговымі камітэтамі. Кіраўнікі: Усевалад Родзька (цэнтральны камітэт), Міхал Вітушка (сябар ЦК), Дзмітрый КасмовічКіравалася створанымі да восені 1942 Цэнтральным Камітэтам і пяццю акруговымі камітэтамі. Кіраўнікі: Усевалад Родзька (цэнтральны камітэт), Міхал Вітушка (сябар ЦК), Дзмітрый Касмовіч (сябар ЦК), Юльян СаковічКіравалася створанымі да восені 1942 Цэнтральным Камітэтам і пяццю акруговымі камітэтамі. Кіраўнікі: Усевалад Родзька (цэнтральны камітэт), Міхал Вітушка (сябар ЦК), Дзмітрый Касмовіч (сябар ЦК), Юльян Саковіч (мінскі акруговы камітэт), Францішак АляхновічКіравалася створанымі да восені 1942 Цэнтральным Камітэтам і пяццю акруговымі камітэтамі. Кіраўнікі: Усевалад Родзька (цэнтральны камітэт), Міхал Вітушка (сябар ЦК), Дзмітрый Касмовіч (сябар ЦК),

- У якасці палітычнай праграмы прапаноўвалася выкарыстанне «непазбежнага канфлікту» саюзнікаў пасля перамогі над Германіяй, мацаванне ўласных (узброеных) сіл і ўзброеная барацьба за незалежнасць Беларусі ва ўмовах узгаданага канфлікту.
- Пасля эвакуацыі з Беларусі ў 1944Пасля эвакуацыі з Беларусі ў 1944 у Германіі быў створаны Замежны Сектар БНП (кіраўнік Дз. Касмовіч). У 1944 кіраўніцтва БНП рэзка крытыкавала Беларускую Цэнтральную РадуПасля эвакуацыі з Беларусі ў 1944 у Германіі быў створаны Замежны Сектар БНП (кіраўнік Дз. Касмовіч). У 1944 кіраўніцтва БНП рэзка крытыкавала Беларускую Цэнтральную Раду і асабіста Р. АстроўскагаПасля эвакуацыі з Беларусі ў 1944 у Германіі быў створаны Замежны Сектар БНП (кіраўнік Дз. Касмовіч). У 1944 кіраўніцтва БНП рэзка крытыкавала Беларускую Цэнтральную Раду і асабіста Р. Астроўскага за кан'юнктурніцтва, марыянеткавы характар дзеянняў, нарэшце, спыніла ўсякае супрацоўніцтва ў пач. 1945. Асабліва моцна БНП выражала незадавальненне няўдалай арганізацыяй «эвакуацыі з Беларусі» ў 1944 і стратай большай часткі асабовага складу БКА, таксама неэфектыўнасцю дзеянняў Астроўскага па стварэнні беларускага войска ў Германіі. Адзначаецца[8], што такія закіды з'яўлялі выключна нямецкія вайсковыя патрэбы канца вайны (задача абароны Германіі кожным коштам).
- Пасля раззбраення батальёну «Дальвіц» у ЧэхііПасля раззбраення батальёну «Дальвіц» у Чэхіі (1945Пасля раззбраення батальёну «Дальвіц» у Чэхіі (1945), частка яго асабовага складу накіравалася ў Беларусь для працягу ўзброенай барацьбы, але на БеласточчынеПасля раззбраення батальёну «Дальвіц» у Чэхіі (1945), частка яго асабовага складу накіравалася ў Беларусь для працягу ўзброенай барацьбы, але на Беласточчыне была выкрыта савецкай бяспекай і амаль цалкам арыштавана. Кіраўнікі былі суджаныя ў «справе шасцёх» (верагодна, май 1946), Родзька і Гелда пакараныя смерцю.
- Пасля вайны БНП дзейнічала сярод беларускіх супольнасцяў у заходніх акупацыйных зонах і Заходняй ЕўропеПасля вайны БНП дзейнічала сярод беларускіх супольнасцяў

# Кіраўнікі КПБ (1917-1993)

- А. Мяснікоў (1917—19),
- В. Міцкевіч-Капсукас (1919—20),
- В. Кнорын (1920—22, 1927—28),
- В. Багуцкі (1922—24),
- А. Асаткін-Уладзімірскі (1924),
- А. Крыніцкі (1924—27),
- Я. Гамарнік (1928—29),
- К. Гей (1930—32),
- М. Гікала (1932—37),
- В. Шаранговіч (1937),
- А. Волкаў (1937—38),
- П. Панамарэнка (1938-47),
- М. Гусараў (1947—50),
- М. Патолічаў (1950—56),
- К. Мазураў (1956—65),
- П. Машэраў (1965—80),
- Ц. Кісялёў (1980— 83),
- М. Слюнькоў (1983—87),
- Я. Сакалоў (1987—90),
- А. Малафееў (1990—93).

# Сучасны этап развіцця сацыяльна-палітычных структур Беларусі.

- У 30-50-я гады кантроль над прызначэннем вышэйшага і сярэдняга роўня чыноўнікаў у БССР ажыццяўлялі цэнтральныя маскоўскія партыйныя і спец.службовыя органы кіравання. Пры рускіх прызначэнцах М.Гусараве (1947-1950) і М.Патолічаве (1950-1956) – з 33 міністраў ураду БССР 22 рускія,1 яўрэй, 2 грузіны і 8 беларусаў. Яны праводзілі палітычныя і культурныя супраць нацыянальных эліт рэпрэсіі і прымусовую калектывізацыю у БССР.
- Пачынаючы з часоў К. Мазурава (1956 - 1965 г.) у БССР на ўладныя пасады пачалі прызначацца этнічныя беларусы
- Плюралізм грамадска-палітычнай думкі і структур пачынаецца ў 1990 – 1991 г. - стварэнне нацыянальнай дзяржавы, дэмакратычнай палітычнай сістэмы ўдзелу і прадстаўніцтва грамадзян, шматпартыйнай сістэмы.